# У ДАІ распавялі, якія дакументы больш не трэба паказваць пры праверцы

У выпадку прыпынку на дарозе інспектарам ДАІ мець пры сабе неабходна толькі два дакументы, паведамляе Sputnik.by.

Нагадаем, новы прэзідэнцкі ўказ аб зменах правілаў дарожнага руху быў прыняты 18 красавіка. Асноўныя нормы дакумента датычацца хуткасных абмежаванняў, сродкаў персанальнай мабільнасці-гіраскутараў, электрасамакатаў, монаколес — і пераліку вадзіцельскіх дакументаў.

— На цяперашні момант гэта вадзіцельскае пасведчанне і пасведчанне аб рэгістрацыі транспартнага сродку (тэхпашпарт). Не трэба мець пры сабе страхоўку і дакумент, які пацвярджае наяўнасць тэхагляду. Супрацоўнікі ДАІ маюць магчымасці праверыць гэта ўсё выдалена — — сказаў намеснік начальніка ГУ ДАІ МУС Беларусі Аляксандр Занімон.

Медыцынскую даведку таксама не абавязкова мець пры сабе. Аднак вазіць яе трэба тым людзям, у якіх на правах ёсць медыцынскі значок чары са змяёй. Гэта азначае, што ў іх ёсць нейкія хваробы, якія перашкаджаюць кіраванню транспартным сродкам. Без меддаведку такія правы будуць лічыцца несапраўднымі, а пратэрмінаваная даведка прыраўноўваецца да яздзе без правоў.

Таксама меддаведка спатрэбіцца пры запісе ў аўташколу, пры адкрыцці новай вадзіцельскай катэгорыі, пры замене старых правоў на новыя, пры аднаўленні правоў пасля пазбаўлення, пры ўладкаванні на "кіроўчую" пасаду, а таксама пры выездзе за мяжу на асабістым аўто.

Колькі можна ездзіць з пратэрмінаванымі правамі?

У снежні мінулага года ў Беларусі быў выдадзены ўказ, якім

аўтаматычна працягвалася дзеянне розных дакументаў, у тым ліку і вадзіцельскага пасведчання. То бок, калі тэрмін дзеяння правоў заканчваўся ў снежні 2021-га, то па іх яшчэ можна ездзіць да чэрвеня 2022-га.

Крыніца sputnik.by




https://sozhnews.by